Аддзел адукацыі  , спорту і турызму Воранаўскага райвыканкама

ДУА “Беняконская сярэдняя школа”

Раённая краязнаўчая навукова-практычная канферэнцыя

**Геральдыка шляхты беняконскай парафіі XIX ст.**

Аўтар: Ляўковіч Аляксандр

Кіраўнік:  настаўнік гісторыі

Дамшэвіч А.Р

аг.Беняконі, 2018

Змест

Уводзіны…………………………………………………………………… 3

Геральдыка шляхты беняконскай парафіі XIX ст……………………………5

1 . Халецкія гербу “Абданк”…………………………………………………5

2. Герасімовічы, Хмілеўскія гербу “Вянява”………………………………6

3. Абрамовічы, Адамовічы, Адынцы, Сцяцэвічы, Тышкевічы гербу «Ляліва»……………………………………………………………………….. 8

4. Галавачы, Грэгаровічы, Загорскія, Мацкевічы гербу “Любіч”…… 10

Заключэнне…………………………………………………………………11

Спіс выкарыстанай літаратуры………………………………………….....12

Дадаткі………………………………………………………………………13

# УВОДЗІНЫ

На дадзены момант найбольш цікавымі і перспектыўнымі ў беларускай гістарычнай навуцы з'яўляюцца даследванні па лакальнай гісторыі. Нельга напісаць паўнавартасную гісторыю нашай Радзімы без гісторыі кожнага горада, мястэчка ці вёскі, а што яшчэ больш важна максімальна асвятліць жыццёвы шлях кожнага асобна ўзятага чалавека. Безумоўна, найбольшую цікаўнасць заўсёды прадстаўлялі прадстаўнікі пануючага саслоўя, у якое ўваходзіла і шматлікая шляхта. Яна мусіла абараняць гонар сваёй вялікай і малой Радзімы і быць прыкладам найвялікшых чалавечых каштоўнасцей, якія панавалі ў даўнія часы сярод нашых продкаў. Неад'емнай часткай гісторыі шляхты і шляхецтва з'яўляецца геральдыка, ці навука аб гербах. Наяўнасць уласнага герба сведчыла не толькі пра асаблівы статус у грамадстве. Герб, у першую чаргу нёс інфармацыю і гісторыю пра той ці іншы род, яго перамогі і паразы. У сувязі з гэтым хацелася б закрануць тэму шляхецкіх родаў Беняконшчыны (маецца на ўвазе шляхта каталіцкага веравызнання, якая належала да беняконскай рыма-каталіцкай парафіі) і разгледзець гэты аспект з пункту гледжання геральдыкі.

Шляхецкая геральдыка Вялікага Княства Літоўскага з’яўляецца неад’емлімай і каштоўнай часткай гісторыі і культуры Беларусі. Герб сам па сабе з’яўляецца арынінальнай, часам адзінай крыніцай гістарычных ведаў, асабліва ў такіх галінах ведаў, як генеалогія, дэмаграфія пануючага саслоўя, палітычная і сацыяльная гісторыя [6, с. 5].

Мэта даследвання – геральдычнае апісанне шляхецкіх родаў Беняконшчыны.

Задачы:

1. Прадставіць прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя, якія пражывалі на тэрыторыі Беняконшчыны XIX ст. ;

2. Даць апісанне гербаў шляхецкіх родаў Беняконшчыны.

## ГЕРАЛЬДЫКА ШЛЯХТЫ БЕНЯКОНСКАЙ ПАРАФІІ XIX ст.

### Халецкія гербу “Абданк”

У XIX ст. у Беняконскай парафіі сустракаецца адзін шляхецкі род гербу “Абданк”. Гэта род Халецкіх, якія у 1827 г. пражывалі ў маёнтку Беняконі[5, с.54]. Найбольш яркім прадстаўніком дадзенай лініі з’яўляецца Аляксандр Халецкі, аратар, лідзкі маршалак у 1624, 1625, 1628, 1632 і 1650 гг. У 1627 годзе быў пасольскім маршалкам на сейме Рэчы Паспалітай.

Герб Абданк – польскі шляхецкі герб перыядаў Польскага каралеўства і Польска-Літоўскага саюза (Рэчы Паспалітай). Упершыню згадваецца ў якасці польскага рыцарскага герба ў 1212 годзе. На тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага пашырэнне набыў пасля Гарадзельскай уніі 1413 года. Дадзеным гербам карысталася звыш 160 родаў на Беларусі, Літве, Польшчы і Украіне.

Апісанне герба:

У чырвоным полі срэбны знак у выглядзе лацінскай літары «W». Клейнод – над прылбіцай з каронай таксама размешчаны знак у выглядзе літары «W». [Дадатак 1]

Паўтарэнні літары V некаторыя гісторыкі і геральдысты бачаць ў ім як бы пачатковыя літары чатырох слоў: Veritas, Viktoria, Virtus і Vita, г. зн. ісціна, перамога, дабрачыннасць і жыццё адпаведна. Каб паказаць яшчэ яскравей, што права на дадзены герб набыта адвагай, некаторыя роды малявалі ў нашлемніку ільва, які і трымае Абданк.[1]

**Герасімовічы, Хмілеўскія гербу “Вянява”**

Да герба «Вянява» належалі два шляхецкіх роды. Сярод іх Герасімовічы, якія жылі ў ваколіцы Кмітоўшчына (1832 г.), Пасольч (1862-1863), маёнтку Кербедзь і вёсцы Літвіца (1836-1842 гг.) [5, с.80] і Хмілеўскія, якія месціліся ў ваколіцы Больценікі (1840 г.) і Бутрыманцы. [7, с.55]

Герб “Вянява” – прыватнаўласніцкі герб, вядомы з пачатку XIV ст. Гербам карысталіся каля 80 родаў Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы, у т.л. Белазоры, Длугашы, Ляшчынскія, Мэнжыкі. У час знаходжання на троне Станіслава Ляшчынскага (1704-1709, 1733) герб «Вянява» выкарыстоўваўся як элемент у дзяржаўнай сімволіцы Рэчы Паспалітай.

Герб выглядае наступным чынам: У полі залатым валовая галава колеру чорнага з рагамі, загнутымі накшталт паўмесяца. У ноздрах у вала забэрзаць круг або кальцо, сплеценыя з драўняных галін. Якая знаходзіцца ў нашлемнике фігура малюецца розна, але па большай частцы ў выглядзе які выходзіць да паловы і звернутага направа льва, з каронай на галаве і мячом у правай лапе. [Дадатак 2]

Пра ўзнікненне гэтага герба ў Польшчы дакладных звестак няма. Лічыцца, што ён прывезены ў польскія землі з Германіі або Венгрыі. Паводле іншых звестак, род Вяняваў (ród Wieniawów) прыбыў у Польшчу разам з чэшскай князёўнай Дамброўкай (Dąbrówką), якая стала жонкай польскага караля Мешкі I, што адносіць яго да 1027 г. Першыя дакладная згадкі пра герб датуюцца 1382 г.

Існуе легенда пра з'яўленне Вянявы, паводле якой падчас палявання князь апынуўся перад пагрозай быць паднятым на рогі. Адзін з яго спадарожнікаў, Ластак (Łastek), схапіў зубра за рогі і адцягнуў яго ў бок ад

князя, затым скарыстаўшыся дубцом з маладога дуба ў якасці насавога кольца, павёў зубра назад да князя, але той выкрыкнуў па-мараўску «Wien haw» («Падыдзі адзін»). Пазней, калі зубра перадалі ў рукі аднаго з прыдворных, бык вырваўся на волю, пасля чаго Ластак забіў яго мячом. Князь узнагародзіў Ластака маёнткам і даравў герб «Wien haw», які стаў Венявай.[2]

## Абрамовічы, Адамовічы, Адынцы, Сцяцэвічы, Тышкевічы гербу «Ляліва»

Герб «Ляліва» - дваранскі герб, які выкарыстоўвалі дваране Польшчы і Літвы. Упершыню герб згадваецца ў 1399 годзе. Згодна меркаванню Яна Длугаша, герб мае нямецкія карані.

Гісторыя герба сыходзіць у XII стагоддзе. Эмблемай, якая паказвае Ляліва, карыстаўся як пячаткай благаславёны Бертольд (каля 1090-1142) з Гарстэна ў 1140 годзе (заснавальнік кляштара бенедыктынцаў у Гарстэне (Аўстрыя), дзе зараз месціцца адзін з самых прыгожых храмаў – прыклад высокага барока ў Аўстрыі).

Актам Гарадзельскай уніі ў 1413 годзе з Ляліва трапіла ў Вялікае Княства Літоўскае (герб быў прыняты ваяводам віленскім Манівідам ад Яна Тарноўскага і Ядзвігі з Лежніц).

Выглядае герб наступным чынам: у блакітным полі залаты маладзік рагамі ўгору, над ім залатая 6-прамянёвая зорка; клейнод – над прылбіцай з каронай на паўлінавых пёрах такія ж маладзік і зорка. Існуюць варыянты герба: з чырвоным полем; са стралой, якая выходзіць угору з зоркі, клейнод – 3 страусавыя пёры; з маладзіком рагамі ўніз, пад ім зорка. [Дадатак 3]

На тэрыторыі беняконскай парафіі пражывала шмат шляхецкіх радоў, якім належаў герб “Ляліва”:

1. Абрамовічы (на момант 1795 г. жылі ў фальварку Тусаманцы)[5,с. 33] ;
2. Адамовічы (1844 па 1905 гг. месціліся ў фальварку Лушчыкоўшчына)[5,с.33];
3. Адынцы (з 1829 па 1833 пражывалі ў Падварышках)[5, с.153];

4. Сцяцэвічы ( у 1839 г. згадваюцца як жыхары фальварку Ёдкішкі)[5, с.192];

5. Тышкевічы (фальварак Кужы (1830 г.), з вескамі Вялікія і Малыя Кужы; фальварак Старыя Раклішкі (1820-1830 гг.), з вескамі Гервішкі, Кавалі, Рудня, Калітанцы, Бутрыманцы).[5, с. 209]

У бітве пад Грунвальдам у 1410 прынялі ўдзел тры харугвы пад гербам Ляліва. Гэта былі харугвы братоў Яна з Тарнова (ваявода кракаўскі) і Спытка з Яраславія, а таксама харугва Вінцэнта з Гранова (кашталян сырэмскі і стараста Велькапольскі).

**Галавачы, Грэгаровічы, Загорскія, Мацкевічы гербу “Любіч”**

Герб “Любіч” – польскі радавы шляхецкі герб. Адзін з найбольш распаўсюджаных шляхецкіх гярбоў, якія выкарыстоўваліся у Рэчы Паспалітай, да якога у Польшчы прапісана больш за ўсіх радоў - больш 500 родаў Польшчы і ВКЛ. Трапляецца на радавых гербах у Польшчы, Беларусі, Літвы, Украіны.

Выглядае наступным чынам: на шыхце, які мае блакітнае поле, выяўлена срэбная падкова, шыпамі звернутая да нізу, і два рыцарскіх лапчатых крыжа: адзін срэбны, (альбо залаты) у сярэдзіне падковы, другі - залаты (альбо срэбны), паверх падковы, на яе вяршыне. Шыхт увенчаны дваранскім шлемам з дваранскаю каронай на нім, і трымя страусовымі пер'ямі паверх кароны, выходзячымі з яе. Намёт на шчыце блакітнага колеру, з падложкай. Існуюць варыянты гербу з аднім срэбным крыжам, з двумя срэбнымі крыжамі,і адзін над другім у сярэдзіне падковы. [Дадатак 4]

З’яўленне гэтага гербу адносяць да XII ст. (каля 1190 г.). Яго выява ў дакументах вядома з 1348 г.[4]

У XIX ст. герб належаў наступным шляхецкім радам беняконскай парафіі:

1. Галавачы (Больценіках (1835-1836 гг.))[5, с. 82];
2. Грэгаровічы (ваколіцы Посальч (1854 г.))[5, с.83];
3. Мацкевічы (ваколіцы Багуславы)[5, с. 132];
4. Загорскія (ваколіца Багуславы (1827-1832 гг.), фальварак Падварышкі (1849 г.))

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Як бачым, тэма геральдыкі беларускай шляхты вельмі цікавая для даследванняў у галіне генеалогіі, палітычнай, сацыяльнай і культурнай гісторыі Беларусі. Гербы заключалі ў сабе патаемны сэнс грамадскай свядомасці і псіхалогіі нашых слаўных продкаў.

Кожны герб меў свае легенды, міфы, гісторыі, якія так ці інакш адбіваліся на іх уладальніках. Кожны элемент на гербе мае сваё значэнне, якому павінны адпавядаць тыя, каму яны належаць.

Беняконская шляхта, як і іншыя местачковыя шляхцічы былі носбітамі той культуры, у лоне якой яны выхоўваліся. Самым галоўным маральным прынцыпам была любоў да Радзімы. Таму, калі склікалася паспалітае рушанне, было гонарам узняць сваю харагву з выявай герба сярод тлуму братоў па сацыяльнаму стану.

Безумоўна, можна разглядаць гэтую праблему з розных бакоў, прыцягваючы да гэтага спецыялістаў розных галін гуманітарнай навукі, што і трэба рабіць. Але, спадзяюся, што сціплы ўклад аўтара дадзенага даследвання паслужыць штуршком ці пачаткам да далейшых пошукаў і адкрыццяў на гістарычнай глебе з мэтай праслаўлення малой Радзімы, якой так ганарыліся нашыя продкі і якой так павінны ганарыцца мы.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. https://ru.wikipedia.org/wiki/Абданк_(герб)\
2. https://be.wikipedia.org/wiki/Герб_«Вянява»
3. https://ru.wikipedia.org/wiki/Лелива_(герб)
4. https://be.wikipedia.org/wiki/Герб_«Любіч»
5. Czesław Malewski . Rodziny szlacheckie na Litwie w XIX wieku Powiaty lidzki, oszmiański i wileński/ Czesław Malewski. - Wydanie I- Warszawa 2016. – 958 s.
6. Adam Boniecki. Poczet rodów w Wielkiem Księstwie Litewskiem w XV i XVI w./ Adam Boniecki. - Warszawa, 1887.
7. Шаланда А.І. Таямнічы свет беларускіх гербаў: Шляхецкая геральдыка Вялікага Княства Літоўскага / Аляксей Шаланда. – Мінск : А.М.Янушкевіч, 2014. – 220 с.

ДАДАТАК 1

**Герб “Абданк”**



ДАДАТАК 2

**Герб “Вянява”**



ДАДАТАК 3

**Герб “Ляліва”**



ДАДАТАК 4

**Герб “Любіч”**

